Паважаныя калегі!

**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ**

запрашае прыняць удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі

# УНІІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З ПОЛЬСКІМ КАРАЛЕЎСТВАМ: ПРАБЛЕМЫ СУВЕРЭНІТЭТУ

Праблемнае поле канферэнцыі:

- Тэорыя дзяржаўнага суверэнітэту ў краінах Еўропы (позняе Сярэднявечча і ранні Новы час);
- Працэсы інтэграцыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў XIV – XVI стст.;
- Узаемаадносіны ВКЛ і Польшчы: ад Крэва да Любліна;
- Люблінская унія 1569 г.: рэальнасць і альтэрнатывы;
- Эвалюцыя ўзаемаадносін ВКЛ з Польшчай у XVII – XVIII стст.

Час правядзення канферэнцыі – **23 – 24 мая 2019 г.**
Плануемае месца правядзення канферэнцыі –
**Мінск, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі**.

**Заяўкі** на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца **да 15 красавіка 2019 г.** па электроннай пошце: v.varonin@outlook.com

У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail. Замежных удзельнікаў просім паведаміць пра неабходнасць візавай падтрымкі, замежных і іншагародніх удзельнікаў – пра неабходнасць браніравання гасцініцы.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі. **Запрашэнні** на канферэнцыю будуць дасланы **да 1 мая 2019 г.**

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Просім даслаць тэксты да **1 кастрычніка 2019** г. Патрабаванні да формы і аб’ёма тэкстаў дакладаў: электронны і раздрукаваны варыянты не болей за 30 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступных спасылках месца і год выдання не падаюцца.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская, англійская.

**Кантакты:**
Васіль Аляксеевіч Варонін,
220072, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1,
Інстытут гісторыі НАН Беларусі.
Тэл. + 375 (17) 284-16-31, факс + 375 (17) 284-18-70,
e-mail: v.varonin@outlook.com

Камандзіровачныя выдаткі за кошт камандзіруючага боку.

**Аргкамітэт**